

«БЕЛЫМ РОСАМ» — 40 ГАДОЎ

5

НАВОШТА ВЕЗЦІ ДЗЯЦЕЙ У КРАСНЫ БЕРАГ?

13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

24 ЛЮТАГА 2023 г. ПЯТНІЦА № 37 (29917)

## КОРАТКА

• **Беларускі дзіцячы фонд запускае з 1 сакавіка марафон міру і дабра.**

• Больш за 50 месцаў пасялення чорнага бусла выяўлена ў Брэсцкай вобласці.

• **Гатоўнасць другога энергаблока БелАЭС — 98 працэнтаў.**

• Слой «Пустыя дамы для продажу» з'явіўся на публічнай кадастравай карце.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Андрэй ІВАНЕЦ, міністр адукацыі:**

*«Патрыятычнае выхаванне навучэнцаў з'яўляецца адным з найважнейшых напрамкаў выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі. У адпаведнасці з новай рэдакцыяй Кодэкса аб адукацыі, цэнтры дапрызыўнай падрыхтоўкі могуць ствараца і функцыянаваць як структурныя падраздзяленні ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Цяпер у краіне функцыянуе 58 такіх цэнтраў ва ўсіх рэгіёнах нашай краіны, у якіх навучаецца больш за 40 тысяч юнакоў і больш за 21 тысячу дзяўчат з 724 школ. Варта адзначыць высокую ступень аснашчанасці гэтых цэнтраў, а таксама даступнасць усіх неабходных навучальных матэрыялаў і макетаў, якія выкарыстоўваюцца для вывучэння прадмета пачатковай ваеннай падрыхтоўкі. Кадры, якія працуюць у цэнтрах, маюць высокую кваліфікацыю. Як правіла, гэта афіцэры з ваеннай і педагагічнай адукацыяй».*

ISSN 1990 — 763X

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Наш шлях ва Украіне — гэта шлях міру»

**Сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з журналістамі працягваюцца. Кіраўнік дзяржавы даў інтэрв'ю прадстаўнікам кітайскіх сродкаў масавай інфармацыі. З беларускім лідарам размаўлялі Лу Цзіньбо, кіраўнік карэспандэнцкага пункта інфармацыйнага агенцтва «Сіньхуа» ў Беларусі і Лу Тунтун, карэспандэнт Медыякарпарацыі Кітая, вядучая праграмы «Размова лідараў».**



Фота БелТА

Асноўнай тэмай размовы сталі беларуска-кітайскія адносіны, іх гісторыя і перспектыва. Журналісты цікавіліся, як развіваецца супрацоўніцтва ў сферы гандлю і эканомікі, якія значныя сумесныя праекты рэалізоўваюцца, у тым ліку і індустрыяльны парк «Вялікі камень», і БНБК, якія новыя магчымасці адкрывае ініцыятыва «Адзін пояс, адзін шлях». Беларускі лідар падзяліўся сваім меркаваннем наконт глабальных геапалітычных працэсаў. Увагу ўдзялілі і канфлікту ва Украіне і магчымасці мірнага ўрэгулявання.

Журналісты спыталі, як Аляксандр Лукашэнка ацэньвае ролю Кітая ў вырашэнні міжнародных праблем. Ён адказаў проста: ніводная праблема ў свеце не можа вырашацца без удзелу КНР. «Кітай стаў глабальнай краінай са сваёй глабальнай палітыкай. Я ведаю: сёння-заўтра Сі Цзіньпін выступіць з заявай або прамовай наконт канфлікту ва Украіне. Прашу звярнуць увагу, што гэта такі незвычайны для кітайскай палітыкі крок. Кітайцы заўсёды акуратныя, асцярожныя. Туды, куды не трэба, не лезуць. Калі яны разумеюць, што гэта не дасць чаканага, патрэбнага выніку, яны таксама не стануць рабіць у гэтым напрамку захады», — падкрэсліў Прэзідэнт. Паводле яго слоў, калі Кітай вырашыў агучыць сваю пазіцыю такім чынам, з вуснаў найвышэйшай службовай асобы — Сі Цзіньпіна, гэта будзе мець сур'ёзныя наступствы. «І калі гэтае пасланне, якое прагучыць з вуснаў лідара Кітая, не будзе пачута тымі, каму яно будзе адрасавана, гэта таксама будзе мець сур'ёзныя наступствы. Таму я, проста забягаючы наперад, раю тым, каму будуць адрасаваны словы Сі Цзіньпіна, прыняць іх сур'ёзна і зрабіць пэўныя крокі. Гэта будзе сур'ёзны голас дзеля міру ў гэтым рэгіёне, — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Аляксандр Лукашэнка выказаў упэўненасць, што заява Старшыні КНР будзе накіравана не на канфрантацыю, у адрозненне ад нядаўняга выступлення прэзідэнта ЗША Джо Байдэна ў Кіеве. Ён падкрэсліў, што гэта выступленне стане вянцом міралюбівай палітыкі Кітая. «Я на сто працэнтаў перакананы. Інакш проста быць не можа. Гэта ўзор міралюбівай палітыкі», — сказаў беларускі лідар. Ён акцэнтаваў увагу, што Беларусь прытрымліваецца такой жа пазіцыі. «Наш шлях ва Украіне — шлях міру. Кітайцы прытрымліваюцца гэтага ж шляху. На сто працэнтаў перакананы, што і расіяне схільныя да таго, каб спыніўся гэты канфлікт. Усё за амерыканцамі — рабіце канкрэтныя крокі да міру — і мір будзе. У аснове гэтага ўсяго вузла сёння апынуўся Кітай. Яшчэ раз раю паслухаць, што скажа Сі Цзіньпін з нагоды гэтага канфлікту. Найўважлівейшым чынам, таму што гэтая заява Кітая — новы крок, арыгінальны крок, які будзе мець сур'ёзныя наступствы ў свеце», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

Нерухомасць

## ІНВЕСТАР ІДЗЕ Ў ПАЛАЦ

### У Гродзенскай вобласці адзначаецца попыт на аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны



Пабудовы радавой сядзібы Храптовічаў у вёсцы Шчорсы Навагрудскага раёна.

**Літаральна за апошнія некалькі гадоў у рэгіёне знайшлі сваіх гаспадароў амаль усе значныя будынкі, якія маюць гісторыка-культурную каштоўнасць. Аднаўляюцца старажытны піўзавод, былая медыцынская акадэмія, палацавы комплекс у Свяцку... Летась прададзены з аўкцыёну яшчэ два палацавыя комплексы — Радзівілаў і Храптовічаў. Попыту спрыяюць і прывабныя ўмовы. Як правіла, такія аб'екты прадаюцца за адну базавую велічыню.**

СТАР. 4

Дзеля памяці

## БОЛЬ, УВЕКАВЕЧАНЫ Ў КАМЕНІ

**На Гомельшчыне ў сярэдзіне сакавіка адзначаць 79-ю гадавіну трагедыі вязняў Азарыцкага лагера смерці, арганізаванага нямецка-фашысцкімі захопнікамі на тэрыторыі Калінкавіцкага раёна. Сёлета ў Год міру і стваральнай працы жыхары рэгіёна ў якасці чаргавога народнага патрыятычнага праекта абралі абнаўленне менавіта гэтага мемарыяльнага комплексу ў памяць ахвяр расправы гітлераўцаў. У Гомелі прапановы архітэктараў па рэканструкцыі знакавага месца памяці разгледзелі на сумесным пасяджэнні абласнога мастацка-эскізнага савета і савета па пытаннях гісторыка-культурнай спадчыны.**

СТАР. 3



# «Наш шлях ва Украіне — гэта шлях міру»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Аляксандр Лукашэнка выказаўся і наконт кітайскага цывільнага паветранага шара, збітага нядаўна амерыканцамі. «Вы цудоўна разумееце сітуацыю ў свеце. Кітаю спакойнага жыцця не будзе. Галоўны сапернік Злучаных Штатаў Амерыкі — Кітай. Амерыканцы гэтага і не ўтойваюць. Сумна, што яны сышлі нават да дробязі. Яны па-амерыканску арганізавалі шоу: напружвалі, напружвалі сваё грамадства, каб усе бачылі, якая «небяспека» ад гэтага кітайскага аб'екта. І калі 300 млн чалавек, амерыканцаў, былі сканцэнтраваны на гэтым аб'екце, яны яго збілі. Для чаго? Выбары хутка. Паказаць свой гераізм», — адзначыў ён. Праўда, як заўважыў Прэзідэнт, потым усе разабраліся, што гэта быў проста недружалюбны крок у адносінах да Кітая. «Кітайцы адразу заявілі, што гэта цывільны шар. Можна было разам разабрацца, што гэта такое. Не, дэманстратыўна яго знішчылі. Гэта вельмі недружалюбны крок», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Не застаўся без увагі журналістаў і Прэзідэнта і нядаўні візіт Джо Байдэна ў Кіеў. Як адзначыў Аляксандр Лукашэнка, гэта падзея стаіць у адным шэрагу з інцыдэнтам з кітайскім паветраным шарам. Ён таксама назваў гэта дробязным, непрыстойным крокам. Пры гэтым беларускі лідар заўважыў, што павhousehold Джо Байдэна як прэзідэнта і яго рашэнне наведаць Кіеў: «Малайчына ён. Сеў, паехаў, спытаў дазволу ў Расіі або папярэдзіў Расію, але, тым не менш, паехаў», — сказаў ён. Але, па словах беларускага лідара, гэта неарыгінальны ход, такі візіт з амерыканскага боку ўжо быў не так даўно. «Навошта? Выбары прэзідэнцкія. Джо Байдэн хоча на кані вайны прыскакаць у гэту выбарчую кампанію. Вось тут дакладна не атрымаецца. Я гэта ведаю добра», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што беларускі бок гатовы адказаць у ваенным плане ў выпадку агрэсіі. Прытым сур'ёзна гатовы адказаць. «Гэтую пазіцыю мы давялі не толькі да Украіны, але і да англічан, ЗША. Спадзяюся, у мяне будзе магчымасць, мы паінфармуем і французаў (усё ж такі ядзерная дзяржава) аб нашай пазіцыі. Мы гатовы да таго, каб абараніць суверэнітэт і незалежнасць нашай краіны. Мы не жадаем вайны. Мы хочам, каб тут усё было мірна, каб нашы людзі мірна, спакойна жылі і супрацоўнічалі з тымі, хто з намі хоча супрацоўнічаць», — сказаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў, што жыхары Беларусі — вельмі міралюбівыя людзі, якія ведаюць, што такое вайна. «Мы ў апошняй вайне страцілі трэцю частку свайго насельніцтва. У чужой фактычна вайне. Так атрымлівалася, што Напалеон у Расію ішоў праз нас — туды і назад, — знішчыў Беларусь. Першая сусветная вайна — тэатр ваенных дзеянняў быў тут, Другая сусветная вайна (для нас Вялікая Айчынная) — тэатр ваенных дзеянняў у асноўным у Беларусі. Мы не хочам ніякай вайны», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што канфлікт на Украіне быў непазбежны і яго першапрычыны ляжаць не ў Расіі. «Так, мы гаворым аб прычынах гэтага канфлікту, але вялікае бачыцца на адлегласці, як у нас гавораць. І для таго, каб ацаніць прычыны гэтага канфлікту, павінен прайсці пэўны час. Гэта чыста ў кітайскім стылі — ніколі не трэба спяшацца. Прыйдзе час, мы расставім усе кропкі над «і». Але я абсалютна згодны з Прэзідэнтам Пуціным, які гаворыць аб тым, што першапрычыны не ляжаць у Расіі», — сказаў ён. Прэзідэнт нагадаў, што здзекі з рускамоўных, з рускай мовы былі і да 2014 года, і ўсё гэта нагняталася заходнімі дзяржавамі. «Натуральна, ні адна краіна, ні Амерыка, ні Кітай, не дазволілі б здзекавацца са сваіх суайчыннікаў. З людзей, якія гавораць проста на рускай мове і жывуць па рускіх звычаях, прымаюць рускую культуру. Тым больш абразы з боку Украіны даходзілі да самога Прэзідэнта Расіі і ўсяго расійскага кіраўніцтва. Там цэлы клубок», — падкрэсліў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў аб заявах былых кіраўнікоў Германіі і Францыі Ангелы Меркель і Франсуа Аланда, якія, як яны самі прызналіся, выкарыстоўвалі мірныя Мінскія пагадненні выключна, каб выйграць час для ваеннай падрыхтоўкі Украіны. «Прычына там — у 2014—2015 гадах. Тут, у Мінску, былі прыняты Мінскія пагадненні. Нармальныя дагаворы, і Украіна падпісала гэтыя дагаворы. Трэба было ісці гэтым шляхам. І сёння — гарантыя — Данбас быў бы ўкраінскім і кіраваўся б з Кіева. Ужо даўно ўсякія шурпатасці былі б забытыя. Маскі сарваныя, карты адкрытыя. Вось вам і ўся прычына, і ўся задума», — канстатаваў ён.

Па словах кіраўніка дзяржавы, і ў Расіі не ўсе з разуменнем успрынялі дзеянні кіраўніцтва краіны. «Я заўсёды расіянам кажу: «Не спяшайцеся, прыйдзе час, і вы ацэніце, хто мае рацыю, хто вінаваты. Некаторыя ў Расіі кажуць: «Ведаеце, Расія паспяшалася, пачаўшы гэтую ваенную аперацыю». А я скажу, што яна была непазбежная. Канфлікт ва Украіне быў непазбежны. Калі б Расія не апярэдзіла гэтую вайну з боку Украіны (цяпер зразумела, хто быў зацікаўлены ў гэтай вайне і хто яе пачаў), не апярэдзіла дзеянні Украіны, ды і ўсяго Захаду з тэрыторыі Украіны — наступствы былі б больш цяжкія», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Не засталася без увагі і тэма санкцый. Беларускі лідар канстатаваў, што санкцыйны ціск ні да чога не прывядзе. «Яны там у эканамічным плане пачынаюць паскудзіць. Граніцы закрылі для перамяшчэння грузавікоў. Самі сабе стрэлілі ў нагу. Мы і так у Заходнюю Еўропу не вельмі перамяшчаемся. А вось з тэрыторыі Еўразаўза праз Польшчу ў Кітай, Казахстан, іншыя напрамкі вельмі шмат перамяшчалася аўтатранспарту, чыгуначнага транспарту. Гэта выгадна ім было. Іх вадзіцелі ехалі ў Кітай, Казахстан, у Расію. Цяпер яны не паедуць. Калі мы са свайго боку закрыем граніцу, то тысячы, тысячы людзей пазбавяцца працы», — сказаў Прэзідэнт.

Яшчэ адзін прыклад — закрыццё Літвой магчымасці для пераваглкі беларускіх грузаў у партах гэтай краіны. «Прытым там наша ўласнасць. Яна закрыла парты для нашых грузаў. Ну што — страцілі мільёны долараў. Мы знайшлі іншыя парты і пастаўляем сваю прадукцыю. І мінулы год у нас быў у фінансавых адносінах лепшы, чым папярэднія гады. Таму санкцыйны рэжым і ціск эканамічны ні да чога не прывядуць», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## У тэму

«Летась у Самаркандзе нашы лідары вырашылі павысіць узровень двухбаковых адносін да ўсёабдымнага стратэгічнага партнёрства. Прэзідэнт падрабязна расказаў пра развіццё адносін паміж Кітаем і Беларуссю. Ён вельмі дасведчаны чалавек. Лічбы паказваюць, што ў напружаны час індустрыяльны парк «Вялікі камень» дынамічна развіваецца. У нашых краін ёсць агульная мова, і нашы погляды аднолькавыя. Бо ўсе мы хочам, каб краіна стабільна развівалася. Як сказаў Прэзідэнт, мы, кітайскі народ, не спяшаемся, мы хочам, каб усё было стабільна. Я паўтара года працую ў Беларусі, і я бачу, што ваша палітыка падобная да кітайскай. І мы таксама хочам, каб Беларусь была краінай, якая стабільна развіваецца. У гэтым мы знайшлі агульную мову», — у размове з беларускімі калегамі падкрэсліў Лу Цзіньбо.

Блізкая ўлада

# ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНЫЯ СУСТРЭЧЫ

## Наталля КАЧАНАВА правяла прыём грамадзян у Савеце Рэспублікі

**Традыцыйна, каб параіцца са спікерам верхняй палаты парламента і папрасіць садзейнічання ў вырашэнні той ці іншай праблемы, ахвотных трапіць на прыём у Савет Рэспублікі было шмат. Гэтым разам грамадзяне звярталіся да Наталлі Качанавай пераважна з пытаннямі, якія датычацца працоўных адносін, падаткаабкладання, жылля, аховы здароўя, зямельнага праваўладання, жыллёва-камунальнай гаспадаркі.**

І калі некаторыя звароты тэматычна былі падобныя — у прыватнасці, некалькі заяўнікаў паскардзіліся Старшыні Савета Рэспублікі на несправядлівыя, як яны лічаць, прэтэнзіі ў іх адрас з боку падатковых органаў — то былі і неардынарныя просьбы. Аляксандр Некраш звярнуўся да Наталлі Качанавай з просьбай аб дапамозе загадзя знайсці для яго сына, інваліда І групы, прыёмную сям'ю. Мінчанін і яго жонка, якая таксама прысутнічала падчас прыёму, не адмаўляюцца ад свайго сына: пакуль жывыя, будуць яго даглядаць. Аднак, па іх словах, яны ўжо немаладыя, і настане той момант, калі іх не будзе або клапаціцца аб сыне яны не змогуць па стане здароўя. У сувязі з гэтым сужэнцы заклапочаны, як у такім выпадку складзецца лёс іх сына.

— У нас больш нікога няма, — патлумачыў Аляксандр Генадзевіч. — Нас чацвёра: мы з жонкай, сын і ўнук, які з'яўляецца курсантам ваенна-тэхнічнага факультэта БДУ.

Наталля Іванаўна пацікавілася, колькі іх сыну гадоў і як здарылася, што ён мае інваліднасць. Бацька расказаў, што Івану 39 гадоў і ён з самага дзяцінства мае патрэбу ў доглядзе. Па яго словах, у радзільным доме хлопчыку занеслі інфекцыю, з наступствамі якой яны ўжо ніколі не справяцца. Наталля Качанава ўважліва выслухала сужэнцаў і дала даручэнне Міністэрству працы і сацыяльнай абароны адсочваць гэтую сям'ю і, калі спатрэбіцца, падставіць плячо дапамогі. «Аднак жывіце доўга», — пажадала спікер верхняй палаты парламента і пацікавілася, ці ёсць у іх яшчэ пытанні.

Аляксандр Некраш расказаў, што жывуць яны ў невялікай кватэры ў адным з мікраараёнаў Мінска, гуляць там асабліва няма дзе. А любому чалавеку, у тым ліку з інваліднасцю, неабходна свежае паветра. У сувязі з гэтым мужчына агучыў яшчэ адну просьбу — дапамагчы набыць недарагі ўчастак зямлі ў Мінскай вобласці для прагулак з сынам. Вядома, небясплатна. Наталля Качанава дала даручэнні адказным асобам аказаць заяўнікам садзейнічанне і знайсці неабходны ўчастак па прымальнай цане. Напрыканцы сустрэчы Старшыня Савета Рэспублікі павіншавала мужчын-заяўнікаў з Днём абаронцаў Айчыны (Аляксандр Некраш, дарэчы, падпалкоўнік Міністэрства ўнутраных спраў, цяпер на пенсіі, але выкладае курсантам) і параіла сям'і, калі яшчэ будуць пытанні, тэлефанаваць у Савет Рэспублікі.

— Ужо практычна 39 гадоў мы даглядаем нашага сына, — расказаў пасля прыёму журналістам Аляксандр Некраш. — Мы звярнуліся з просьбай да Наталлі Іванаўны ў выпадку немагчымасці яго даглядаць знайсці яму сям'ю ў доме сямейнага тыпу, каб ён не застаўся адзін. У доме інвалідаў ён не зможа: проста загіне... Другая просьба звязана з тым, што Івану трэба рухацца, ён стамляецца ад пастаянна знаходжання ў кватэры. У сына шмат любімых фільмаў, але 24 гадзіны ў суткі немагчыма глядзець тэлевізар. Трэба выязджаць на прыроду, пажадана з начлегам. Папрасілі падабраць невялікі і недарагі ўчастак, каб я мог яго туды вазіць. Наталля Іванаўна дала адпаведныя даручэнні.

Па словах заяўніка, такія прыёмы грамадзян — вельмі добрая практыка. «Я разумею, што ў Наталлі Іванаўны вялікі аб'ём работы, дзяржаўных спраў, вялікая занятасць, няпростая міжнародная абстаноўка, але, нягледзячы на гэта, яна знаходзіць час, каб пагаварыць са звычайнымі людзьмі, выслухаць тое, што іх хвалюе, — звярнуў увагу Аляксандр Некраш. — Такія сустрэчы даюць надзею, веру. Нам гэта вельмі патрэбна. Мы вельмі ўдзячны за такую магчымасць».

**Вераніка КАНЮТА.**

**З якімі яшчэ пытаннямі і просьбамі грамадзяне звярталіся да Старшыні Савета Рэспублікі, чытайце ў найбліжэйшым выпуску «МС».**

Фінансы

# У сакавіку стаўка рэфінансавання зніжаецца да 11 % гадавых

**Пра такое рашэнне паведаміла прэс-служба рэгулятара па выніках пасяджэння па грашова-крэдытнай палітыцы праўлення Нацыянальнага банка.**

Таксама з першых дзён сакавіка зніжаецца стаўка па крэдыце авернайт з 12,5 % да 12 % гадавых, стаўка па дэпазіце авернайт — з 10,5 % да 10 % гадавых.

У банку адзначылі, што інфляцыйныя працэсы працягваюць запавольвацца. Гадавая інфляцыя ў студзені 2023 года знізілася да 12 % з 12,8 % у снежні 2022 года. Трэндавая інфляцыя ўпала да 9,2 % з 10,2 % адпаведна. Тэмпы прыросту спажывецкіх цэн у апошнія месяцы складваюцца на нізкіх узроўнях. Гэта спрыяе далейшаму запаволенню гадавой інфляцыі, якая, паводле ацэнак, знізіцца да аднаазначнага значэння ўжо да канца І квартала бягучага года.

Адным з фактараў, які паўплываў на прынятае рашэнне, стала тое, што ў студзені 2023 года захаваўся прыток рублёвых сродкаў насельніцтва ў банкі. Разам з тым, ашчадныя працэс застаецца стрыманым. Адначасова адзначаецца паскораны рост ліквіднасці грашовай масы, што можа адбіцца на дынаміцы запаволення інфляцыі, лічаць у галоўным банку краіны.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

Тэлефонныя лініі ў суботу, 25 лютага, з 9.00 да 12.00 праводзяць:

- кіраўнік спраў Брэсцкага аблвыканкама Сяргей Мікалаевіч ЛАБАДЗІНСКІ. Тэл. 8 016 226 99 26;
- старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў Уладзімір Уладзіміравіч ЦЯРЭНЦЬЕЎ. Тэл. 8 021 222 22 22;
- кіраўнік спраў Гомельскага аблвыканкама Алена Уладзіміраўна КЛІЧКОЎСКАЯ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- першы намеснік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Юрый Мікалаевіч ВАЛЯВАТЫ. Тэл. 8 015 273 56 44;
- першы намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Сяргей Канстанцінавіч САВІЦКІ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Аляксандр Уладзіміравіч САВІЦКІ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- кіраўнік спраў Мінскага гарвыканкама Ганна Мар'янаўна МАТЭЛЬСКАЯ. Тэл. 8 017 222 44 44.

# БОЛЬ, УВЕКАВЕЧАНЫ Ў КАМЕНІ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Праект абнаўлення «Мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці» прадставілі супрацоўнікі інстытута «Гомельграмадзянпраект». **Аўтарскі калектыў архітэктараў установы ў 2021 годзе быў адзначаны прэміяй Прэзідэнта Беларусі «За духоўнае адраджэнне» за стварэнне мемарыяльнага комплексу «Ала» ў Светлагорскім раёне. Адзін з лаўрэатаў Сяргей Пярвіцкі** цяпер выступае ў якасці галоўнага архітэктара праекта рэканструкцыі мемарыяла ў Азарычах. На стварэнне канцэпцыі і эскізы спатрэбілася больш за паўгода. Чарговы народны праект, на думку архітэктара, будзе не менш цікавы і маштабны.

— Мемарыял набудзе іншыя памеры і размесціцца на пляцоўцы прыблізна 100 на 200 метраў. Комплекс будзе насычаны мемарыяльнымі элементамі, — адзначыў **галоўны архітэктар праекта «Рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці» Сяргей ПЯРВІЦКІ.**

Праектам прадугледжана рэстаўрацыя існуючага пахавання і ўзвядзенне новых элементаў, якія будуць сімвалічна адлюстроўваць маштабы трагедыі генацыду беларускага народа ў Азарычах.



**Галоўны архітэктар праекта «Рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці» Сяргей ПЯРВІЦКІ.**

Нагадаем, што з 10 да 19 сакавіка 1944 года ў канцлагерах пад агульнай назвай Азарычы арміі вермахта на невялікую плошчу ў багністай мясцовасці сагналі каля 50 тысяч грамадзянскага насельніцтва — жыхароў Гомельскай, Магілёўскай, Палескай абласцей Беларусі, а таксама Смаленскай і Арлоўскай абласцей Расіі. Пад адкрытым небам ад холаду, смагі і голаду ўсяго за дзесяць дзён у лагеры памерла звыш 15 тысяч чалавек. Вядома, што канцлагеры такога тыпу былі выкарыстаны толькі ў Беларусі. Упершыню ў гады Другой сусветнай вайны вязняў выкарыстоўвалі ў якасці біялагічнай зброі: спецыяльна звозілі хворых на сыпны тыф і іншыя хваробы, заражалі людзей з разлікам, што пасля інфекцыя перакінецца на часці Чырвонай Арміі, што наступаюць.

— На мемарыяльным комплексе таксама будзе ўзведзены памятны знак у гонар подзвігу савецкіх ваенных медыкаў, якім пасля вызвалення палонных удалося спыніць эпідэмію тыфу, — растлумачыў Сяргей Пярвіцкі.

З гісторыі вядома, што калі савецкія байцы вызвалялі вязняў, велізарная нагрузка лягла на ваенных медыкаў 1-га Беларускага фронту, санітарную службу. Была створана каранцінная зона, разгорнута сетка шпіталяў, дэзынфекцыйных пунктаў, амбулаторый.

Аб усіх дэталях жудаснай трагедыі на беларускай зямлі наведвальнікі змогуць даведацца ў музеі, які прадугледжаны праектам рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу. Запланавана ўзвядзенне і таких новых элементаў, як «Вежа памяці», «Сцяна смутку», «Камень прасвятлення», памятны знак воінам-вызваліцелям, стылізаваныя слупы агароджы з архіўнымі фотаздымкамі.

Між тым, існуючы абеліск на месцы Азарыцкага лагера смерці быў узведзены ў маі 1965 года. Тры стэлы, на якіх высечаны вобразы вязняў — жанчын, дзяцей, старых, — вынік ажыццяўлення ідэі архітэктараў па аднаўленні мемарыяла ў 1974 годзе. У канцы 2021 года праект рэканструкцыі мемарыяльнага комплексу «Лагер смерці Азарычы — боль і памяць» на конкурс грамадзянскіх ініцыятыў Гомельскай абласной асацыяцыі мясцовых Саветаў дэпутатаў прапанавала ініцыятыўная група Азарыцкага сельвыканкама. Ідэю актывістаў падтрымалі на ўсіх узроўнях. Цяпер абнаўленне і рэканструкцыя мемарыяльнага комплексу вязням Азарыцкага лагера смерці абяцаюць стаць чарговым народным патрыятычным праектам, як мемарыялы «Ала», «Партызанская крынічка». Падтрымаць рэканструкцыю месца памяці ў Калінкавіцкім раёне на Гомельшчыне плануюць прафсаюзныя арганізацыі ўсіх раёнаў рэгіёна і абласнога цэнтра.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

Абітурыент-2023

# ШКОЛЬНЫЯ АДЗНАКІ ПРАЙШЛІ НЕЗАЛЕЖНУЮ ПРАВЕРКУ

**Падчас рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену максімальна магчымы вынік (100 балаў) здолелі набраць 115 навучэнцаў.**

У прэс-службе Міністэрства адукацыі паведамілі, што 48 адзінаццацікласнікаў паказалі максімальны вынік па матэматыцы, 18 — па рускай і беларускай мовах, 27 — па замежных мовах, 12 — па грамадазнаўстве, 5 — па біялогіі, 4 — па хіміі і адзін — па фізіцы. Былі і тыя, хто ўмудрыўся набраць на рэпетыцыі нуль балаў. Такіх аказалася 110 чалавек. Усяго рэпетыцыйны цэнтралізаваны экзамен 28 студзеня здавалі 52 082 вучні.

Для таго каб параўнаць вынікі навучэнцаў на рэпетыцыйным ЦЭ з іх школьнымі адзнакамі пасля другой чвэрці бягучага навучальнага года, была сфарміравана рэпрэзентатыўная выбарка з 4,4 тысячы навучэнцаў з розных рэгіёнаў. У яе ўключылі навучэнцаў з Мінска (Маскоўскага раёна сталіцы), Віцебска, а таксама з Барысаўскага, Магілёўскага і Лідскага раёнаў.

Як і пры правядзенні рэпетыцыі цэнтралізаванага экзамену, якая прайшла ў канцы мінулага года, у значнай колькасці навучэнцаў вынік выканання тэста пры пераводзе яго са стабальнай шкалы ў дзесяцібальную (па зацверджанай шкале пераводу) або супаў са школьнай адзнакай, або адрозніваецца ад яе не больш як на адзінку.

У сярэднім па ўсіх вучэбных прадметах у 28,8 працэнта ўдзельнікаў выбаркі вынік па дзесяцібальнай шкале поўнасцю супаў са школьнай адзнакай. У 38,6 працэнта навучэнцаў ён быў горшы за школьную адзнаку за другую чвэрць, а 32,4 працэнта навучэнцаў атрымала вынік, лепшы за школьную адзнаку.

Сярэднія балы па навучальных прадметах, набраныя ўдзельнікамі рэпетыцыі, знаходзяцца ў раёне пяцідзесяцібальнай адзнакі. У Міністэрстве адукацыі падкрэсліваюць: статыстычныя размеркаванні тэставых балаў па вучэбных прадметах маюць нязначную асіметрыю, якая сведчыць аб тым, што, нягледзячы на некаторае зніжэнне ўзроўню складанасці экзаменацыйных матэрыялаў, тэст не стаў простым для большасці ўдзельнікаў экзамену. Пры гэтым тэставыя матэрыялы, прапанаваныя ўдзельнікам рэпетыцыі, засталіся збалансаванымі па ўзроўні складанасці для праверкі ведаў усіх навучэнцаў (як моцных, так і слабых) і аказаліся даступныя і выканальныя для ўсіх катэгорый навучэнцаў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Надвор'е

# Кажуць, што ў мінулы чацвер былі апошнія сур'ёзныя маразы. Далей мы чакаем вясну

## Праўда, холад яшчэ канчаткова не сышоў, а моцны вецер і галалёдзіца сапсуюць надвор'е на наступным тыдні

**У Дзень абаронцаў Айчыны ўмовы надвор'я на тэрыторыі краіны працягнуў фарміраваць халодны антыцыклон. Пасля халоднай ночы днём сонца праявіла сябе даволі актыўна, што спрыяла павышэнню тэмпературы паветра.**

На змену марознаму антыцыклону з Заходняй Еўропы на тэрыторыю нашай краіны ссунуцца атмасферныя франты, за якімі пачне паступаць цёплая паветраная маса атлантычнага паходжання. Тэмпературны фон павысіцца, а ападкі будуць пераходзіць са снегу ў мокры снег і дождж. Паведамляецца, што цёплае з ападкамі (у асноўным у выглядзе дажджу і мокрага снегу) надвор'е захавваецца ў Беларусі да канца тыдня, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

У пятніцу пройдуць ападкі (снег, мокры снег, дождж). Раніцай і днём у многіх раёнах чакаецца галалёд, на дарогах — галалёдзіца. У гэты дзень Белгідрамет абвясціў аранжавы ўзровень небяспекі.

У суботу на большай частцы тэрыторыі Беларусі прагназуюцца працяглыя ападкі ў выглядзе мокрага снегу і дажджу, удзень месцамі моцныя ападкі. У асобных раёнах — туман, галалёд, галалёдзіца. Месцамі па ўсходзе краіны — узмацненне ветру парывамі да 15—18 м/с. Тэмпература паветра ноччу панізіцца да мінус 3 — плюс 4 градусаў. Удзень тэмпература будзе ў межах ад мінус 1 градуса па поўначы да плюс 8 градусаў па паўднёвым усходзе.

У нядзелю таксама чакаецца некамфортнае надвор'е. У гэты дзень на большай частцы тэрыторыі краіны будуць ападкі ў выглядзе снегу, мокрага снегу, ноччу — з дажджом. Месцамі — слабая мяцеліца, узмацненне ветру парывамі да 15—20 м/с, на дарогах галалёдзіца. Уначы тэмпература паветра складзе ад мінус 6 да плюс 1 градуса. Днём прагназуецца ад мінус 5 градусаў па поўначы да плюс 4 градусаў па паўднёвым усходзе.

Паводле папярэдняга прагнозу айчынных сіноптыкаў, у пачатку наступнага працоўнага тыдня франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю краіны, а фон атмасфернага ціску пачне расці, ападкаў стане менш. Пры гэтым тэмпературны фон панізіцца і ў начныя гадзіны будзе знаходзіцца ў межах адмоўных значэнняў, а днём — вагацца ад слабаадмоўных да слабададатных значэнняў.

У панядзелак будзе пераважна без ападкаў, толькі ноччу і раніцай па паўночным усходзе краіны пройдзе невялікі снег. Месцамі на дарогах чакаецца галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы апусціцца да 3—10 марозу, а пры праясненнях — да мінус 13 градусаў. Днём чакаецца мінус 4 — плюс 2 градусы.

У апошні дзень лютага ноччу па поўначы, удзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя ападкі (снег, мокры снег, днём магчымы дождж). У асобных раёнах чакаюцца слабыя туман і галалёд, на дарогах — галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—10 марозу, а пры праясненнях — да 13 градусаў ніжэй за нуль. Удзень тэмпература паветра будзе ў межах ад мінус 3 да плюс 3 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Орбан: Еўропа страціла сваю незалежнасць і ваенную магутнасць з-за канфлікту ва Украіне

Еўрапейскія краіны страцілі свой суверэнітэт, ваенную і эканамічную магутнасць з-за ўкраінскага канфлікту, а таксама спроб ЗША выкарыстоўваць падзеі ва Украіне ва ўласных інтарэсах. Аб гэтым заявіў кіраўнік венгерскага ўрада Віктар Орбан, паведамляе ТАСС.

Паводле слоў Орбана, Еўропа аслабла з-за таго, што Белы дом навязвае амерыканскія інтарэсы Еўрасаюзу ва ўрон еўрапейскім. Пры гэтым «цунамі санкцый» разбураюць еўрапейскую эканоміку, у той час як Злучаныя Штаты, у якіх ёсць свае энергарэсурсы, знаходзяцца ў баку ад такіх цяжкасцяў. Орбан таксама лічыць, што ваенны патэнцыял еўрапейскіх дзяржаў слабее. Гэта звязана з тым, што Еўропа пастаўляе зброю Кіеву і не мае магчымасці папоўніць свае арсеналы.

«Еўропа менш як за год страціла сваю незалежнасць, эканамічную і ваенную магутнасць», — зрабіў выснову Орбан.

У такіх умовах Венгрыі неабходна кіравацца ўласнымі інтарэсамі, тады яна зможа пераадолець цяжкасці і стаць мацнейшай, лічыць Орбан. На яго думку, для гэтага трэба захаваць палітычную незалежнасць Венгрыі, прытрымлівацца курсу на неўмяшанне ў падзеі ва Украіне, забяспечыць эканамічную стабільнасць.

## Кіраўнік МЗС Іспаніі Альбарэс заявіў, што Захад не будзе адпраўляць войскі ва Украіну

Міністр замежных спраў Іспаніі Хасэ Мануэль Альбарэс заявіў, што заходнія краіны не будуць адпраўляць войскі ва Украіну. Пра гэта паведамляе агенцтва EFE.

Па словах Альварэса, краіны Захаду не пойдуць на такі крок ні пры якім сцэнарыі. «Ні ва ўрада Іспаніі, ні ў ЕС, ні ў НАТА няма сумненняў у тым, што ва Украіне няма ні іспанскіх, ні еўрапейскіх, ні натаўскіх салдат, і гэта павінна заставацца вельмі ясным», — растлумачыў палітык. Кіраўнік іспанскага МЗС дадаў, што ўся ваенная дапамога, якую каралеўства накіроўвае Кіеву, з'яўляецца «абаронным матэрыялам». Раней паведамлялася, што прэм'ер-міністр Іспаніі Педра Санчэс прыбыў у Кіеў для сустрэчы з прэзідэнтам Украіны Уладзімірам Зяленскім.

## Біл Гейтс купіў амаль 4 % акцый у піваварнай кампаніі Heineken



Мільярдэр і сузаснавальнік Microsoft Біл Гейтс набыў 3,76 % акцый вядомага галандскага піваварнага канцэрна Heineken Holding NV (HEIO.AS). Пра гэта паведамляе агенцтва Reuters.

У заяве Упраўлення па фінансавых рынках Нідэрландаў гаворыцца, што здзелка адбылася 17 лютага. Гейтс набыў акцыі ў мексіканскай піваварні FEMSA, якая прадае акцыі. Паводле даных агенцтва, FEMSA прадала ўсе свае 18 мільёнаў акцый розным пакупнікам, якімі яна валодала ў Heineken Holding. Сам жа Гейтс купіў 10,8 млн акцый за €883 млн ($939,87 млн) зыходзячы з бягучай цаны на рынку.

# ІНВЕСТАР ІДЗЕ Ў... ПАЛАЦ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

## ПАЛАЦ, ЯШЧЭ ПАЛАЦ...

Як вядома, прадаць аб'екты са статусам гісторыка-культурнай каштоўнасці няпроста. Уласніка чакае нямала ўмоў і абавязацельстваў. Да таго ж і кошт даволі высокі. Таму гістарычныя аб'екты доўгі час могуць стаяць непрыдатнымі. Але летась у такой справе адчуўся пэўны рух, паведамілі ў камітэце «Гроднааблмаёмасць».

Напрыклад, былы палац Радзівілаў у Дзятлаве прадаваўся з 2020 года. Аб'ект знаходзіўся на балансе раёна. Агульная плошча двухпавярховага будынка складае 1,5 тысячы «квадратаў». Ёсць чатыры прыбудовы і зямельны надзел. Палац Радзівілы пабудавалі ў 1751 годзе ў стылі барока і ракако. Будынак неаднойчы мяняў уласнікаў. Некаторы час тут знаходзіліся шпіталь, прытулак для дзяўчат, школа. Да 2010 года — размяшчалася гарадская стаматалогія. Потым — гады запусцення.

Сітуацыя змянілася пасля таго, як кошт аб'екта стаў амаль мінімальным. Палацам зацікавіўся расійскі бізнесмен. Як паведамілі ў Дзятлаўскім райвыканкаме, цяпер ён ужо трэці месяц з'яўляецца ўласнікам старажытнага палаца. Будынак, які ўваходзіць у спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў, абышоўся яму ў тры базавыя велічыні.

Што канкрэтна плануе размясціць у старажытным будынку новы ўласнік, дакладна невядома. Ёсць меркаванне, што там можа з'явіцца рэабілітацыйны цэнтр альбо іншы аб'ект сацыяльнай накіраванасці. Ва ўсялякім выпадку, гэта стане вядома ў хуткім часе, паколькі бізнесмен павінен распрацаваць праектную дакументацыю на працягу двух гадоў, а максімум праз пяць — завяршыць рамонтныя работы і прадставіць будынак у яго новым абліччы.

За мінімальны кошт куплены летась комплекс аб'ектаў палаца Храптовічаў. Гэта сядзіба ў аграгарадку Шчорсы пад Навагрудкам — самае буйное радавое гняздо, якое належала дыпламату, міністру замежных спраў, апошняму канцлеру ВКЛ Іахіму Храптовічу. Палацава-паркавы ансамбль у стылі французскага класіцызму ўзводзіўся з удзелам знакамітага італьянца Джузепэ Сако. Сюды наведваліся каралеўскія, шляхетныя і знакамітыя асобы.

У пачатку ХХ стагоддзя сядзіба прыйшла ў заняпад, сам палац згарэў у Першую сусветную вайну, але некаторыя аб'екты засталіся. У савецкі час у будынку былой бібліятэкі знаходзілася школа, у флігелі — дзіцячы садок і жылыя кватэры. Гаспадарчыя пабудовы адышлі да мясцовай гаспадаркі. Як і палац у Дзятлаве, сядзіба доўгі час пуставала, хоць і выстаўлялася на аўкцыён. Але жадаючых набыць яе не знаходзілася, пакуль стартавая цана не знізілася да адной базавай велічыні. У аддзеле эканомікі Навагрудскага райвыканкама паведамілі, што такія ўмовы выклікалі нават ажыятаж. Праўда, будынкі прадавалі паасобку. У выніку таргоў стартавая цана вырасла. Былы флігель быў прададзены за 23 тысячы рублёў жыхару Мінска. Палацавы ансамбль падзялілі паміж двума ўласнікамі. Напэўна, тут мяркуецца стварыць турыстычны комплекс з гасцініцай і музейнай экспазіцыяй. І ў гэтым ёсць логіка. Навагрудскі раён — адзін з самых папулярных у турыстаў, а старажытны аб'ект у новым выглядзе, вядома, зацікавіць многіх.



Вяндлярня на сядзібе Храптовічаў.

## ЭЛІТНЫЯ КВАТЭРЫ Ў ЦАРСКІХ КАЗАРМАХ

Летась пасля некалькі беспаспяховых аўкцыёнаў у Гродне ўдалося прадаць два ўнікальныя аб'екты нерухомасці. І тут не абышлося без уплыву цанавога фактару. Спачатку будынкі былых царскіх казармаў выстаўляліся за 1,2 і 1,4 млн рублёў. І толькі пасля чацвёртай спробы, калі кошт знізіўся на 80 %, — да 316 і 290 тысяч рублёў адпаведна, іх набыла кампанія «Палессежылбуд».

Будынкі былой царскай казармы па вуліцы Шчорса ўваходзілі ў склад вялікага ваеннага гарадка, які лічыцца найстарэйшым на тэрыторыі Беларусі. Першыя казармы закладваліся ў 1886 годзе. Усяго было ўзведзена звыш 20 разнастайных збудаванняў. У розныя перыяды тут стаялі ваенныя часці, месціўся шпіталь. Падчас нямецкай акупацыі ў гарадку стварылі «Шталаг-324», дзе ўтрымлівалі тысячы палонных савецкіх салдат.

Да нашага часу дайшло некалькі казармаў, якія былі пераабсталяваны пад інтэрнаты. Некаторы час іх лёс быў пад пытаннем. Але будынкам пашанцавала з інвестарам, які ўжо меў вопыт аднаўлення падобных забудоў у Брэсце. Нават ёсць меркаванне, што праект з казармамі сёння ў трэндзе. Вось і ў Гродне забудоўшчык плануе іх адрамантаваць пад элітныя жылыя дамы з захаваннем гістарычных канструкцый. Трэба сказаць, што ўмовы даволі жорсткія — уся работа павінна быць завершана за тры гады. Між тым, праект рэканструкцыі ўжо цяпер здзіўляе. У будучых дамах пашыраць вокны, адкрыюць аўтэнтычную цагляную кладку, зробяць французскія балконы. Перабудова закране ўсе перакрыцці, яны будуць новыя. Што датычыцца кватэр, то мяркуюць зрабіць як студыі па 28 «квадратаў», так і трохпакаёўкі на 70. Унутраны двор закрыты — тут размесціцца дзіцячыя пляцоўкі і велапаркоўка. Кошт «квадрата» пакуль не агучваецца, затое вядома, што завяршыць рэканструкцыю тут плануюць да 2024 года.

У Гродне пачаўся актыўны продаж будынкаў гістарычнага цэнтра. Гэта дамы па вуліцы Вялікая Траецкая, Карла Маркса, дзе будуць аб'екты грамадскага прызначэння, у прыватнасці, гасцініцы, хостэлы, крамы.

## ПАДВЁЎ АЗАРТ

Аб'екты, як бачым, прадаюцца, і гэта добра. Але ёсць тут і адваротны бок. Не заўсёды іх набываюць сапраўдныя гаспадары, бо толькі азарту і жадання нешта зрабіць недастаткова. Некаторыя інвестары не ў поўнай ступені разумеюць, з чым ім прыйдзецца сутыкнуцца. Бо набыццё аб'екта, які мае статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, накладвае істотныя абавязацельствы па яго ўтрыманні і аднаўленні. Не ўсе інвестары да гэтага гатовыя і ў фінансавым плане. Не знаходзяць патрэбныя рэсурсы, адпаведна, работы не вядуцца, аб'ект разбураецца, што ў рэшце рэшт прыводзіць да яго вяртання ў дзяржаўную маёмасць.



Сінагога XVII стагоддзя ў Слоніме.

З такой сітуацыяй сутыкнулася жыхарка Мінска, якая набыла ў Слоніме найстарэйшую сінагогу Беларусі за 30 тысяч рублёў. Перад гэтым будынак прайшоў некалькі аўкцыёнаў. Як паведамілі ў аддзеле культуры Слонімскага райвыканкама, уласніца вырашыла вярнуць аб'ект мясцовым уладам, бо палічыла, што не справіцца з аб'ёмам работ, які трэба было выканаць у вызначаны тэрмін. Праз асабістых дабрачынны фонд не ўдалося сабраць сродкі нават на праект рэканструкцыі, кошт якога склаў 50 тысяч долараў ЗША.

Летась сінагога зноў аказалася ў статусе пустой нерухомай маёмасці і вясной будзе паўторна выстаўляцца на аўкцыён. Кошт аб'екта вызначае райвыканкам. Дарэчы, ёсць даныя, што сінагогу ў Слоніме меў намер выкупіць фонд «Яўрэйская спадчына», аднак адмовіўся з-за таго ж вялікага аб'ёму работ. Падлічылі, што на рэканструкцыю патрэбна каля 5 млн еўра. Між тым, аб'ект у 1642 годзе быў пабудаваны за сродкі мясцовай яўрэйскай абшчыны. У свой час збудаванне было галоўным архітэктурным аб'ектам гандлёвай плошчы Слоніма.

## ШТО НА ЧАРЗЕ

Тут зноў варта згадаць сядзібу Храптовічаў. Літаральна днямі на аўкцыён выстаўляецца даволі незвычайны аб'ект. Гэта былая вяндлярня, якая знаходзіцца непадалёк ад сядзібы і належыць аддзелу культуры Навагрудскага райвыканкама. Аб'ект мае круглую форму і даволі спецыфічны па сваёй канструкцыі. Чарговы продаж будзе весціся з паніжэннем кошту ў два разы і складзе амаль 10 тысяч рублёў. Патрабаванні да будучага ўласніка такія ж, як пры набыцці іншых аб'ектаў гісторыка-культурнай каштоўнасці — правесці рэканструкцыю і аднаўленне ў адпаведныя тэрміны і з умовамі ахоўных абавязацельстваў.

Таксама ў Навагрудку мяркуюць выставіць на аўкцыён старажытны двухпавярховы будынак, дзе некалі месцілася школа мастацтваў. Ці знойдуцца на яго прэтэндэнты, у аддзеле эканомікі райвыканкама не бяруцца сказаць. Як правіла, інтарэс да нерухомай маёмасці ўзнікае тады, калі аб'ект прапануюць за адну базавую велічыню. Пакуль з усімі папярэднімі зніжкамі кошт будынка складае 95 тысяч рублёў.

У камітэце дзяржмаёмасці згадалі яшчэ адзін цікавы аб'ект, які знаходзіцца ў вёсцы Поразава Свіслацкага раёна. Сядзіба «Багудзенкі» будавалася ў канцы XIX стагоддзя мясцовым памешчыкам і з'яўляецца помнікам драўлянага дойлідства. Доўгі час тут знаходзілася пасялковая бальніца, а апошнія гадоў дваццаць аб'ект пустуе. За гэты час ён ужо прадаваўся, але беспаспяхова. На найбліжэйшым аўкцыёне ў сакавіку стартавая цана на сядзібу складзе амаль 30 тысяч рублёў. Будучы ўласнік можа размясціць тут гасцініцу, кемпінг, выкарыстаць яе як агратурыстычны альбо адміністрацыйна-гаспадарчы аб'ект.

Трэба сказаць, што апошнім часам змяніліся падыходы да рэканструкцыі гісторыка-культурных аб'ектаў трэцяй катэгорыі, якія лічацца каштоўнасцю мясцовага значэння. Некаторыя працэдуры спрасціліся, перададзены на ўзровень мясцовых улад, што дазваляе вырашаць пытанні рэканструкцыі больш аператыўна і актывізаваць інвестараў.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота з адкрытых крыніц.**

**Святлана ЛЕНДЗІНА, намеснік старшыні камітэта «Гроднааблмаёмасць»:**

— Летась у Гродзенскай вобласці ўцягнуты ў абарот 118 пустых аб'ектаў камунальнай уласнасці, пераважная большасць прададзена з аўкцыёну. Менавіта продаж з'яўляецца прыярытэтным спосабам уцягвання маёмасці ў гаспадарчую дзейнасць. Летась камітэтам дзяржаўнай маёмасці аблвыканкама праведзена звыш 420 аўкцыёнаў, у тым ліку электронных таргоў. Выручка ад продажу склала 5,5 млн рублёў, што ў два разы больш за папярэдні год. Колькасць праведзеных аўкцыёнаў у параўнанні з 2021 годам павялічылася на 32 %. Звыш двух дзясяткаў аб'ектаў выкупілі арандатары, 124 знесены. У выніку ўсіх мерапрыемстваў колькасць нявыкарыстаных плошчаў зменшылася больш чым на 111 тысяч кв. м.

Сёлета плануецца прадаць 300 аб'ектаў. Інфармацыя аб продажы маёмасці размешчана на афіцыйных сайтах органаў выканаўчай улады і ў адзінай інфармацыйнай базе нявыкарыстанай маёмасці.

Конкурсы

# Найлепшы ляснічы — дзяўчына

### У Беларусі такое прызнанне адбылося ўпершыню

**Па выніках работы ў 2022 годзе пераможцам конкурсу прафесійнага майстэрства прызнана Таццяна МЯШЧАНАВА, ляснічы Раманавіцкага лясніцтва Гомельскага доследнага лягаса. Пра гэта паведамляе прэс-служба Мінлясгаса.**

Свой працоўны шлях у лясной гаспадарцы Таццяна Уладзіміраўна пачала ў 2001 годзе. Першы запіс у працоўнай кніжцы — майстар лесу Макееўскага лясніцтва. Праз шэсць гадоў, у 2007 годзе, узначаліла Раманавіцкае лясніцтва.

Яго плошча складае больш за пяць тысяч гектараў — 90 працэнтаў зямель пакрыты лесам. Летась лесааднаўленне і лесаразвядзенне тут правялі на плошчы звыш 30 гектараў. Прыжывальнасць лясных культур першага года склала 90,6 працэнта. Гэта найлепшы паказчык сярод усіх удзельнікаў конкурсу. Немалаважна, што ў лясніцтве за мінулы год не было зарэгістравана ніводнага лясного пажару.

Конкурс «Найлепшы ляснічы года» стаў ужо традыцыйным. Галоўная яго мэта — павышэнне прафесійнага майстэрства работнікаў падпарадкаваных арганізацый. Спаборніцтва традыцыйна праходзіць у некалькі этапаў: спачатку найлепшых ляснічых вызначаюць у рэгіёні абласцей, затым — краіны.

Кожнага з канкурсантаў прафесійнае журы ацаніла больш як па 20 розных паказчыках, сярод якіх — выкананне работ па лесааднаўленні і лесаразвядзенні, нарыхтоўка насення лясных раслін, правядзенне высечак догляду, барацьба з ляснымі пажарамі і браканьерствам і многае іншае. Не засталіся без увагі дзелавыя і прафесійныя якасці канкурсантаў, а таксама іх стаж работы ў сістэме Мінлясгаса і непасрэдна ляснічым.



Фота з сайта Мінлясгаса.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

Прэм'ера

# З ІМІ ПРЫХОДЗІЦЬ НОВАЕ ЖЫЦЦЁ

**У панядзелак вечарам, 27 лютага, на тэлеканале АНТ стартуе адна з чаканых прэм'ер — паказ чарговага сезона серыяла «Тэст на цяжарнасць-3». Шматсерыйны кінафільм пра жыццё і адносіны Наталлі Бахмецьевай (Святлана Іванова) працягвае знаёміць гледачоў з гісторыяй знакамітага ўрача і яе калег, дзякуючы якім штодня ў свет прыходзяць новыя людзі.**



У цэнтры сюжэта новага сезона па-ранейшаму жыццёвыя перыпетыі доктара Бахмецьевай, у якой пачаўся новы, пераломны, перыяд. Пастаянныя канфлікты з галоўным урачом вымушаюць жанчыну пакінуць перынатальны цэнтр і шукаць сабе новае месца працы, дзе яе талент быў бы запатрабаваны ў поўнай меры. Аднак, аказваецца, зрабіць тое вельмі няпроста. А вось у асабістым жыцці за сэрца Наталлі па-ранейшаму змагаюцца дастойныя мужчыны. Каму ў выніку яна аддасць перавагу — пытанне адкрытае...

Акцёрскі склад у новым сезоне папоўніўся: цяпер тут можна ўбачыць Крысціну Арбакайтэ, Яўгена Проніна, але не абыдзецца і без любімых ужо Аляксандра Яцко, Лянкі Грыу, Кірыла Грэбеншчыкова і іншых. Глядач зноў будзе назіраць за тым, як яго любімыя персанажы праяўляюць сябе ў звыклых і зусім новых абставінах. Нязменна ж кожны з герояў змагаецца за жыццё пацыентаў і сваё асабістае шчасце. А як тое адбываецца — зусім хутка ўбачым на канале АНТ.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 166

**Сваю задачу прапануе Міхаіл Кошаль з Мінска (гл. дыяграму).**



**Белыя:** Kpe2, Лb4, Cf5, Kc2, Kd1, пп. c5, d4 (7).

**Чорныя:** Kpd5, пc7 (2).

Мат за 2 хады.

**Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Хмяльніцкага, 10а, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru**

* * *

Дзве новыя задачы на мат за 3 хады даслаў Віктар Жук з Брэста.

**№ 1.**

**Белыя:** Kph1, Фh3, Cd6, Ke3 (4).

**Чорныя:** Kpe4 (1).

**Блізня:** Ke3 на e7.

**№ 2.**

**Белыя:** Kpc3, Фh4, Cg6, Kg4 (4).

**Чорныя:** Kpf4 (1).

**Блізня:** Kpc3 на d2.

* * *

У Рагачове прайшло першынство Беларусі да 18 гадоў. Сярод юнакоў (34 гульцы) першае месца заняў майстар FIDE Арцём Сіняўскі, другое — Аляксей Грыгаровіч (у іх па 7 балаў з 9 магчымых), трэцяе — майстар FIDE Міхей Навуменка (6,5 бала). Сярод дзяўчат (21 удзельніца) найлепшая была майстар FIDE Ксенія Зелянцова, якая выйграла 8 партый пры адной нічыёй. Сярэбраны медаль у Веранікі Абрамкінай (7 балаў), бронзавы — у Мілены Сідарэні (6,5).

На Мемарыяле Лазавацкага ў Чалябінску (157 гульцоў) Аляксей Фёдараў фінішаваў на 10-м месцы, Дзяніс Лазавік — на 13-м, Вячаслаў Зарубіцкі — на 16-м, Міхаіл Нікіценка — на 18-м, Максім Царук — на 24-м, Арцём Стрыбук — на 31-м, Аляксей Аляксандраў — на 44-м, Кірыл Ступак — на 61-м. У жаночым турніры (73 удзельніцы) Варвара Палякова і Ксенія Зелянцова занялі адпаведна 25-е і 28-е месцы.

У вельмі моцным па складзе анлайн-турніры па хуткіх шахматах на сайце chess.com (149 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік быў сямнаццаты.

* * *

Прапануем дзве партыі з леташняга чэмпіянату Беларусі ў першай лізе.

Ксенія Норман — Вячаслаў Зарубіцкі. 1. e4 c5 2. Kc3 Kc6 3. f4 g6 4. Kf3 Cg7 5. Cb5 Kd4 6. 0-0 a6 7. Cc4 b5 8. Cd5 Лb8 9. d3 e6 10. Cb3 Cb7 11. Ce3 Ke7 12. C:d4 cd 13. Ke2 Фb6 14. Kph1 0-0 15. Фe1 a5 16. a4 Cc6 17. Фh4 ba 18. C:a4 Ф:b2 19. Cb3 Л:b3 20. cb Ф:e2 21. Лfd1 Kf5 22. ef C:f3 23. gf Ф:f3+ 24. Kpg1 ef 25. Фf2 Фd5 26. Фd2 Ф:b3 27. Л:a5 h5 28. Лe1 Лc8 29. Фe2 Лc2 30. Фf3 Фb4 31. Лa8+ Kph7 32. Лae8 Cf6 33. Л8e2 Лc3 34. Лd1 Kpg7 35. Лg2 h4 36. h3 Фb3 37. Kph2 Ce7 38. Лdd2 Cd6 39. Лb2 Фa3 40. Лa2 Фc1 41. Лad2 Л:d3 42. Л:d3 C:f4+ 43. Ф:f4 Ф:f4+ 44. Kpg1 Kpf6 45. Лe2 g5 46. Лf2 Фe4 47. Лfd2 Kpe5 48. Kpf1 Фh1+ 49. Kpe2 g4 50. hg fg 51. Л:d4 Фf3+ 52. Kpe1 Фe3+, 0:1.

Ільля Цюрын — Ігар Люцко. 1. b3 e5 2. Cb2 d6 3. e3 Kf6 4. Ke2 Kbd7 5. c4 g6 6. d4 Cg7 7. Kbc3 0-0 8. Фd2 Лe8 9. h3 a6 10. g3 c6 11. Cg2 e4 12. 0-0 b5 13. cb ab 14. Лac1 Kb6 15. a4 ba 16. K:a4 Cd7 17. Ca3 Cf8 18. Kec3 Kbd5 19. Фc2 Фe7 20. Лa1 h5 21. K:d5 K:d5 22. Kc3 Kf6 23. Cb2 Cf5 24. Ka4 Фb7 25. Kc3 Лab8 26. g4 hg 27. hg K:g4 28. C:e4 C:e4 29. K:e4 Ф:b3 30. Ф:b3 Л:b3 31. Cc1 Л:e4 32. f3 Лe:e3 33. C:e3 K:e3 34. Лfc1 c5 35. dc dc 36. Лa8 Kpg7, 0:1.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца: 1. Kd8! ~ 2. Фf4+, 1...e5 2. Фd5+, 1...Лe2 2. Фf3+, 1...g5 2. Фf5+. Правільна адказалі Ігар Ананіч, Міхаіл Кошаль, Васіль Жуковіч, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**





# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

## Настальгія па любімай гісторыі

